*ДУК “Мастоўская раённая бібліятэка”*
*Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы*

# *Краязнаўчы каляндар на 2026 год*

*Масты, 2025*

# *Краязнаўчы каляндар на 2026 год*

**540 гадоў** з часу першага ўпамінання ў Літоўскай метрыцы **г.Масты** (1486)

**425 гадоў** з часу атрымання граматы на магдэбурскае права **г.Масты** (1601)

**35 гадоў** з часу адкрыцця **Мастоўскага дзяржаўнага музея "Лес і чалавек"** (1991)

## СТУДЗЕНЬ

**1 – 55 гадоў** з часу заснавання **ААТ "Мастоўдрэў"** (1971)

**16 – 115 гадоў** з дня нараджэння **Валюка Юзафа** (нар. у 1911г., аг.Лунна Мастоўскага р-на – 1979), польскага ваеннага дзеяча

**30 – 65 гадоў** з дня нараджэння **Якалцэвіч Марыі Антонаўны** (нар. у 1961г., в.Дуляўшчына Мастоўскага р-на), беларускага мовазнаўца, педагога. Кандыдата філалагічных навук.

## ЛЮТЫ

**12 - 75 гадоў** з дня нараджэння **Семака Алега Мсціслававіча** (нар.у 1951г., в.Лунна Мастоўскага раёна), беларускага філосафа.

**16 - 85 гадоў** з дня нараджэння **Котава Сяргея Міхайлавіча** (нар.у 1941г., в.Зарудаўе Мастоўскага раёна), заслужанага работніка аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

## КРАСАВІК

**4 – 130 гадоў** з дня нараджэння **Траяна Івана Сямёнавіча** (нар. у 1896г., в.Малыя Азёркі Мастоўскага раёна – 1977) савецкага ваеннага дзеяча, генерала-маёра, удзельніка Першай сусветнай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

**21 - 55 гадоў** з дня нараджэння **Амелькі Сяргея Уладзіміравіча** (нар. у 1971г., в.Міжава Мастоўскага раёна), беларускага гісторыка, кандыдата гістарычных навук, дацэнта.

## МАЙ

**3 - 70 гадоў** з дня нараджэння **Атаманава Алега Уладзіміравіча** (нар. у 1956г., в.Дарагляны Мастоўскага раёна), філолага, паэта, кампазітара, барда.

**12 - 85 гадоў** з дня нараджэння **Севяртокі Іосіфа Іосіфавіча** (нар. у 1941г., в.Семярэнкі Мастоўскага раёна), вучонага-біёлага, доктара біялагічных навук, прафесара.

## ЧЭРВЕНЬ

**4 – 65 гадоў** з дня нараджэння **Бяйцюка Юрыя Расціслававіча** (нар. у 1961г., в.Лунна Мастоўскага раёна), беларускага фізіка, інжынера, педагога.

**17 - 65 гадоў** з дня нараджэння **Фядотава Сяргея Аляксеевіча** (нар. у 1961г. - 2022), культурнага дзеяча, дырэктара Мастоўскага раённага цэнтра культуры, лаурэата прэміі імя А.І.Дубко Гродзенскага аблвыканкама "За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва" у намінацыі "Клубны работнік года" (1999).

## ЖНІВЕНЬ

**24 - 80 гадоў** з дня нараджэння **Лойка Тамары Васільеўны** (нар. у 1946г., в.Лаўна Мастоўскага раёна), вучонага-гісторыка, культуролага.

**25 - 80 гадоў** з дня нараджэння **Кобрынца Пятра Мікалаевіча** (нар. у 1946г., в.Дубна Мастоўскага раёна – 1994), беларускага гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара. У 1973-1994гг. працаваў у ГрДУ імя Я.Купалы.

## ВЕРАСЕНЬ

**5 - 95 гадоў** з дня нараджэння **Салея Івана Сямёнавіча** (нар. у 1931г., в.Раўкі Мастоўскага раёна – 2012), Героя Сацыялістычнай працы, заслужанага будаўніка БССР.

**23 - 70 гадоў** з дня нараджэння **Мацюка Аляксандра Антонавіча** (нар. у 1956г., Масты), беларускага музычнага дзеяча, спевака, музыканта, кампазітара, педагога.

**28 - 70 гадоў** з дня нараджэння **Вараб'ёва Віталя Уладзіміравіча** (нар. у 1956г., в.Мікелеўшчына Мастоўскага раёна), беларускага вучонага ў галіне біяхіміі. Заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі беларусь. З 1979г. працуе ў ГрДМУ.

**30 - 70 гадоў** з дня нараджэння **Надольнік Ліліі Іванаўны** (нар. у 1956г., в. Курылавічы Мастоўскага раёна), беларускага вучонага ў галіне біяхіміі, доктара біялагічных навук. 1995-2023гг. – праца ў Інстытуце біяхіміі біялагічна актыўных злучэнняў НАН Беларусі ў Гродне.

## КАСТРЫЧНІК

**5 - 80 гадоў** з дня нараджэння **Амелькі Уладзіміра Паўлавіча** (нар. у 1946г., в.Міжава Мастоўскага раёна) беларускага журналіста. Працаваў начальнікам упраўлення ідэалагічнай работы Гродзенскага аблвыканкама.

**2 – 75 гадоў** з дня нараджэння **Саітавай Валянціны Іванаўны** (нар. у 1951г., в. Пладовая Мастоўскага раёна), бібліяграфазнаўца, кандыдата педагагічных навук (1992г.), дацэнта (1994г.), прафесара кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнайсці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

## <u>ЛІСТАПАД</u>

**10 - 115 гадоў** з дня нараджэння **Свіркі Станіслава** (нар. у 1911г., в.Нёман Мастоўскага раёна – ?), беларуска-польскага літаратуразнаўца, фальклaрыста .